Во время педагогической практики студенты выполняли задания по определению уровня гражданской воспитанности младших школьников, которые включали выдвижение конкретных задач гражданского воспитания и отбор педагогически целесообразного содержания и средств воспитательной работы; установление гуманных взаимоотношений с младшими школьниками, родителями и педагогами; организацию внеклассных мероприятий по гражданскому воспитанию с младшими школьниками.

Таким образом, оптимальными условиями подготовки будущих учителей к организации гражданского воспитания младших школьников являются: четкая постановка целей и задач; планирование, оценка и самооценка деятельности; постепенное усложнение практических заданий в период педагогической практики и анализ результатов деятельности.

Л.А. Казінец

Рэспубліка Беларусь, г. Мінск,

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка

## ПРАБЛЕМА ФАРМІРАВАННЯ ДУХОЎНАГА СВЕТУ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ: ПОШУК І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯЕ РАШЭННЯ

Сёння наша грамадства ставіць перад вну важную і складаную задачу — падрыхтаваць духоўна багатую, адукаваную, творчую асобу настаўніка. Наяўнасць у краіне высока падрыхтаваных і здольных настаўнікаў, якія аддаюць душу і сэрца справе выхавання і навучання — неабходная умова для далейшага грамадства у цэлым і школы, у прыватнасці.

Рэспубліка Беларусь перажывае пераломны, крытычны этап грамадскага развіцця, які характарызуецца адмовай ад папярэдніх каштоўнасных арыенціраў, заменай іх новымі. У такіх умовах звычайна адбываецца паварот у духоўна-маральнай арыентацыі студэнцкай моладзі. Таму праблема фарміравання грамадзянскай пазіцыі студэнтаў, асабліва педагагічных навучальных устаноў, становіцца як ніколі актуальнай.

Апытанне, якое мы праводзілі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, паказала разуменне будучымі настаўнікамі таго, што чалавек з'яўляецца вышэйшай, ні з чым не параўнальнай каштоўнасцю. Ен — стваральнік матэрыяльных і духоўных цэннасцей грамадства.

Цікавыя адказы мы атрымалі на пытанне: "Што робіць жыццё маладых людзей шчаслівымі?" Большая частка апытаных (48,7% ) лічаць, што шчаслівым жыццё маладых людзей робіць "матэрыяльнае забеспячэнне", 16,4% — "сямейны дабрабыт", 9% — "добрыя адносіны з акружаючымі людзьмі", 11,6%

— "цікавая праца", 7% — "самастойнасць, незалежнасць", 1,8% — "высокае службовае становішча", 1,1% — "актыўны удзел у грамадскім жыцці, у вырашэнні праблем, якія стаяць перад дзяржавай".

Нас вельмі ўстрывожыў той факт, што каштоўнасці духоўнай культуры, літаратуры, мастацтва пакідаюць значную частку моладзі раўнадушнымі.

Значны інтарэс мае праблема выкарыстання студэнцкай моладдзю вольнага часу. Толькі 6,3% апытаных лічаць, што у г. Мінску дастаткова магчымасцей для задавальнення сваіх інтарэсаў і патрэбнасцей у вольны час. Астатнія перакананы, што гэтых магчымасцей недастаткова. Цяжкае матэрыяльнае становішча не дазваляе ім выкарыстоўваць рацыянальна вольны час. Праводзяць вольны час з сябрамі 34% апытаных, наведваюць дыскатэкі, вечары адпачынку — 15%, займаюцца самаадукацыяй — 7,3% , наведваюць тэатры, музеі, выставы — 1,8%, займаюцца спортам – 10%, у гуртках мастацкай самадзейнасці і тэхнічнай творчасці — 4,2%, чытаюць літаратуру, часопісы — 1,6 %. Відавочна, што кола інтарэсаў будучых настаўнікаў не вызначаецца шырыней.

Даследаванне дае падставу меркаваць, што новае пакаленне маладых людзей арыентуецца ў асноўным на сённяшні дзень і неадкладнае задавальненне сваіх патрабаванняў. Назіраецца пераарыентацыя моладзі з духоўных на прагматычныя каштоўнасці.

Новыя пакаленні засвойваюць духоўныя каштоўнасці, створаныя папярэднікамі. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што станаўленне і развіццё асобы будучага настаўніка — гэта працэс паступовага засваення ім духоўных каштоўнасцей, маральнага вопыту. Пры гэтым неабходна памятаць, што прызнанне прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей не азначае абход нацыянальных. Іх трэба разглядаць у адзінстве з нацыянальнымі.

Працэс станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці і абумовіў неабходнасць далучэння моладзі да культуры беларускага народа, яго традыцый, абрадаў, глыбокае пазнанне гісторыі краю, роднай мовы. Вырашэнне гэтых задач звязана з фарміраваннем патрыятызму ў школьнікаў і будучых настаўнікаў. Выхоўваць дзяцей адданымі патрыётамі, свядомымі грамадзянамі здолае педагог з высокім пачуццём нацыянальнай годнасці, які ведае і шануе духоўную спадчыну, культурна-гістарычныя каштоўнасці свайго народа, які ўмее развіць пачуцце любві да роднага краю, мовы беларусаў, народных традыцый.

Патрыятызм з'яўляецца адным з найбольш глыбокіх пачуццяў, замацаваных вякамі і тысячагоддзямі. Як феномен грамадскай свядомасці, патрыятызм меў месца ва ўсе гістарычныя часы і эпохі і насіў агульначалавечы

характар. Ідэі і пачуцці патрыятызму заўсёды давалі штуршок развіццю культуры, з'яўляліся стымулюючымі фактарамі ў дзейнасці людзей.

Наша даследаванне паказала, што многія духоўныя каштоўнасці беларускай культуры не радуюць сэрцы значнай часткі будучых настаўнікаў, а таму не служаць сродкамі іх маральнага развіцця, што вядзе да нацыянальнага нігілізму, страце духоўных сувязей з мінулым і будучыняй.

Калі выпускнікі педагагічных ВНУ будуць добра ведаць гісторыю роднага краю, мову свайго народа, яго культуру, калі будуць прафесійна падрыхтаваны, яны стануць багацей духоўна.

Вядучым фактарам фарміравання духоўнага свету моладзі з'яўляецца вучэбны працэс. Змены ў свядомасці студэнта пачынаюцца з засваення пэўнай пазнавальнай інфармацыі. У змесце адукацыі трэба значнае месца адвесці народнай педагогіцы, вуснай народнай творчасці. Іх пазнанне дазволіць вызначыць крытэрыі маральнасці, праверыць свае думкі і меркаванні.

Выніковасць і эфектыўнасць вучэбнага працэсу значна павышаецца, калі заняткі дапаўняюцца пазааўдыторнай дзейнасцю. У працэсе гэтай дзейнасці выкладчык мае больш магчымасцей дапамагчы студэнту сфарміраваць уласны маральны вопыт.

Перспектывы маральнага выхавання, узбагачэння духоўнага свету моладзі вызначаюцца тым, наколькі мы зможам супрацьпаставіць націску дэфармаванай субкультурнай сацыялізацыі сістэму агульначалавечых каштоўнасцей, якія вызначаюць змест выхавання. На аснове грамадскіх маральных катэгорый паспрабуем вызначыць платформу выхавання моладзі.

Рэалізаваць мэты выхавання, сфарміравасць грамадзянскую пазіцыю падрастаючага пакалення, зацвердзіць прынцыпы дэмакратызацыі і гуманізацыі магчыма не столькі ў асобных мерапрыемствах і справах, колькі ў стварэнні атмасферы прыстойнасці, паважлівых адносін адзін да аднаго.

Неабходна памятаць, што ідэалы чалавецтва, грамадства, народа існавалі і існуюць зараз. Пытанне ў тым, якія каштоўнасці мы павінны сёння паставіць на першы план. Сучасная сітуацыя дае магчымасць школе і ВНУ самім фарміраваць ці вызначаць для сябе ідэалы і каштоўнасці. Неабходна больш звяртаць увагі на такія агульначалавечыя ідэалы, як праўда, дабрыня і прыгажосць.

У студэнцкія гады чалавек павінен прайсці школу выхавання добрых пачуццяў. Паколькі ім кіруюць не проста веды, а перакананні і пачуцці, неабходна клапаціцца аб тым, каб дзеянні выкладчыкаў пакідалі эмацыянальны след у студэнтаў.